**ПАРАДАК ПРЫЁМУ ГРАМАДЗЯН І**
**ПРАДСТАЎНІКОЎ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ**
**у перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў**
**Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

**З 11 мая па 14 жніўня 2020 г.**

у Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў устаноўлены наступны парадак прыёму грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі Цэнтральнай камісіі:

работнікамі апарату Цэнтральнай камісіі штодзённа ў рабочыя дні з 9.00 да 18.00 (па серадах з 8.00 да 18.00). Перапынак з 13.00 да 14.00.

Старшынёй і сакратаром Цэнтральнай камісіі па папярэднім запісе ў адпаведнасці з графікам:

| Назва пасады | Дні прыёму | Час прыёму |
|---|---|---|
| Старшыня камісіі | чацвер | 14.30 – 18.00 |
| Сакратар камісіі | панядзелак | 14.30 – 18.00 |

Папярэдні запіс грамадзян на асабісты прыём да Старшыні і сакратара Цэнтральнай камісіі ажыццяўляецца па тэлефонах: **(+375 17 ) 327 19 03;**
**(+375 17 ) 222 68 79.**

Пры адсутнасці Старшыні Цэнтральнай камісіі асабісты прыём праводзіць сакратар Цэнтральнай камісіі.

Асабісты прыём ажыццяўляецца пасля прад’яўлення заяўнікам дакумента, які сведчыць яго асобу. Прадстаўнікі заяўнікаў прад’яўляюць таксама дакументы, якія пацвярджаюць іх паўнамоцтвы.

Службовыя асобы, якія праводзяць асабісты прыём, а таксама работнікі апарату, упаўнаважаныя ажыццяўляць папярэдні запіс на асабісты прыём да Старшыні і сакратара камісіі, маюць права адмовіць у асабістым прыёме, запісу на асабісты прыём у выпадку:

звароту па пытаннях, якія не адносяцца да кампетэнцыі Цэнтральнай камісіі;

звароту ў неўстаноўленыя дні і гадзіны;

калі заяўніку ў ходзе асабістага прыёму ўжо быў дадзены вычарпальны адказ на пытанні, якія яго цікавяць;

калі з заяўнікам спынена перапіска па пытаннях, выкладзеных у звароце.

У тым выпадку, калі вусны зварот грамадзяніна не можа быць вырашаны непасрэдна падчас прыёму, ён выкладаецца ім у пісьмовай форме і падлягае далейшаму разгляду ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Прыём ажыццяўляецца па адрасе: г. Мінск, вул. Савецкая, 11, (Дом Урада, правае крыло, уваход *з боку пл. Незалежнасці побач з касцёлам св. Сімеона і Алены толькі па прад'яўленні пашпарта).*